Літаратура:
1. Воссташий из пепла [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/vosstavshiy-iz-pepla.html.– Дата доступа: 03.10.2024.
2. Фарный костёл (собор) святого Франциска Ксаверия [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://turby.by/restaurant/farnyj-kostel-sobor-svyatogo-frantsiska-ksaveriya.– Дата доступа: 06.10.2024.

# КУЛЬТУРНАЯ І ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА САЛІГОРСКА

**Бялова Н. І.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.

Даследаванне хрысціянскіх аб'ектаў горада Салігорска і Салігорскага раёна (у тым ліку на аснове аналізу крыніц [1; 2]): гісторыя ўзнікнення, архітэктурныя асаблівасці, сучасны стан і роля ў жыцці мясцовых жыхароў, уплыў на культуру і грамадства рэгіёну – галоўная мэта дадзенай працы.

Архітэктура цэркваў Салігорска ўяўляе сабой спалучэнне розных стыляў. Свята-Троіцкая царква пабудавана ў класічным стылі, Свята-Мікольская – у стылі мадэрн.

Кафедральны сабор Нараджэння Хрыстовага – гэты манументальны будынак, які спалучае элементы традыцыйнага праваслаўнага дойлідства і сучаснай архітэктуры. Храм каменны з масіўнымі скляпеннямі, архівольты і нішы пакрыты фрэскамі. Канструкцыя храма ўключае асноўны трохпавярховы аб'ём, трапезную, флігелі і званіцы. Аб'ёмы завяршаюцца барабанамі з панарамным шкленнем і залатымі купаламі. Званіцы выкананы па тыпу адкрытых ратондаў. Унутраныя памяшканні ўпрыгожаны стракатым насценным жывапісам, кафляй, керамікай і багатым тэкстылем. Вакол храма разбіты парк. Тэрыторыя сабора абнесена невялікай сцяной з каменнымі пілонамі і мастацкім ліццём.

Царква Покрыва Прасвятой Багародзіцы пабудавана ў 1795 годзе ў вёсцы Чыжэвічы. У 1807 годзе яна згарэла, але хутка была адноўлена і ў 1808 годзе была зноў адкрыта. На працягу ўсяго XIX стагоддзя будынак шмат разоў падвяргаўся рамонту. Прыход царквы быў вялікі: у яго ўваходзіла 7 бліжэйшых паселішчаў, што складала амаль 2000 вернікаў. У 1861 годзе была ўзведзена званіца з 12 званамі, вышыня якіх дасягала 27 метраў.

У 1913 г. настаяцелем царквы стаў іерэй Іаан Панкратовіч. Ён быў апошнім настаяцелем перад закрыццём храма ў 1937 г. У гады Вялікай Айчыннай вайны храм зноў быў адкрыт, і ў ім пачалі праводзіцца богаслужэнні. У 1989 годзе храм поўнасцю прайшоў рэстаўрацыю. З 1992 па



Репозиторий ГрГМУ

1995 гады на тэрыторыі двара храма пабудавалі хрысцільню і адміністрацыйны будынак, які выкарыстоўваецца ў якасці бібліятэкі і памяшкання нядзельнай школы. На базе парафіі размешчаны Царкоўна-гістарычны музей Слуцкай епархіі. Будынак храма з'яўляецца помнікам драўлянага дойлідства рэспубліканскага значэння і ўваходзіць у лік драўляных старажытных храмаў на тэрыторыі Беларусі.

Касцёл Святога Антонія Падуанскага быў пабудаваны ў 1993 годзе. Гэта адзіны каталіцкі храм у Салігорску, які адрозніваецца элегантным неараманскім стылем. У ім праводзяцца службы, культурныя мерапрыемствы, такія як канцэрты і выставы.

У Салігорскім раёне таксама дзейнічаюць пратэстанскія абшчыны. Найбуйнейшай з іх – царква "Хрыстос для ўсіх". Пратэстанскія цэрквы Салігорскага раёна адрозніваюцца актыўным удзелам у сацыяльным жыцці рэгіёна. Яны праводзяць розныя дабрачынныя мерапрыемствы, аказваюць падтрымку людзям, якім неабходна дапамога.

У Салігорску на пачатку 20 стагоддзя існавала невялікая сінагога, аднак яна была разбурана падчас рэвалюцыі 1917 года.

Такім чынам, царква (праваслаўная, каталіцкая і пратэстанцкая) аказвае спрыяльны ўплыў на грамадскія працэсы, фармуючы маральныя каштоўнасці, падтрымліваючы традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. Пры садзеянні царквы праходзяць культурныя мерапрыемствы, якія прыцягваюць увагу мясцовых жыхароў і садзейнічаюць развіццю культурнага жыцця рэгіёна. Уплыў цэрквы на грамадства праяўляецца яе ўдзелам ў вырашэнні сацыяльных праблем. Хрысціянскія арганізацыі часта аказваюць падтрымку людзям, арганізуючы дабрачынныя акцыі. Яны спрыяюць развіццю адукацыі і культуры, адкрываючы нядзельныя школы, бібліятэкі і культурныя цэнтры.

Літаратура:

1. Достопримечательности Солигорского района [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://planetabelarus.by/sights/filter/location-is-0000000178/?ysclid=m1nlnliv ta676808945. – Дата доступа: 09.10.2024

2. Историко-культурное наследие [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://soligorsk.museum.by/node/57910?ysclid=m1nj7za5w8396417670. – Дата доступа: 09.10.2024

Репозиторий ГрГМУ